# БАРЫСАЎ — КУЛЬТУРНАЯ СТАЛІЦА БЕЛАРУСІ 2021 ГОДА

Асобае месца сярод многіх беларускіх гарадоў з багатым гістарычным мінулым займае Барысаў. Ён цікавы турыстам з Беларусі, Расіі і іншых краін і ўсім тым, хто ведае і любіць еўрапейскую гісторыю, архітэктуру і культуру. Горад даў свету і краіне нямала вядомых прозвішчаў. Знакавай фігурай з'яўляецца І. Х. Каладзееў — вядомы ў Беларусі бібліяфіл і землеўладальнік, калекцыянер і мецэнат канца XIX — пачатку XX ст. Барысаўшчына — радзіма вучоных-медыкаў, якія аказалі значны ўплыў на развіццё айчыннай медыцыны. Сярод іх — дактары медыцынскіх навук афтальмолаг Т. В. Бірыч, нейрахірургі А. Л. Леановіч і М. В. Паўлавец, кардыяхірург Ю. П. Астроўскі. Будучы міністр замежных спраў СССР А. А. Грамыка вучыўся ў Барысаўскім сельскагаспадарчым тэхнікуме. Ураджэнцы горада народны мастак Беларусі А. А. Анікейчык і заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі В. Ф. Шкаруба, творчасць якіх атрымала сусветную вядомасць, з'яўляюцца лаўрэатамі Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Уклад у развіццё музычнага мастацтва Беларусі ўнеслі кампазітар Р. П. Бутвілоўскі, дырыжор узорна-паказальнага аркестра Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь А. У. Фёдараў. Прызнанымі майстрамі тэатральнай сцэны сталі народная артыстка СССР Н. М. Бурмістрава і заслужаны артыст Беларусі, дыктар беларускага радыё І. Л. Курган. Літаратурныя традыцыі падтрымлівалі ў горадзе такія пісьменнікі і паэты, як Янка Купала, В. В. Зуёнак, С. І. Законнікаў, А. С. Ставер, М. М. Мятліцкі, Г. В. Далідовіч і інш. У сувязі з атрыманнем Барысавам ганаровага статусу «Культурная сталіца Беларусі 2021 года» на працягу ўсяго года праводзяцца акцыі, форумы, шматлікія мерапрыемствы. Гораду на Бярэзіне ёсць пра што расказаць і ёсць што паказаць сваім гасцям.

У бюлетэні «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку» (2021, № 3), які выдаецца Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, змешчаны бібліяграфічны спіс «Барысаў — культурная сталіца Беларусі 2021 года». Прадстаўлены матэрыял уключае звесткі пра ўзнікненне, развіццё, архітэктурныя асаблівасці, багатую культурную спадчыну Барысава. Бібліяграфічны спіс складаецца з наступных раздзелаў: «Гісторыя горада на Бярэзіне», «Гісторыка-культурная спадчына горада», «Барысаў прамысловы», «Культурнае жыццё горада». Усе раздзелы спіса суправаджаюцца невялікімі нарысамі. Некаторыя бібліяграфічныя апісанні крыніц дапоўнены анатацыямі, што дазваляе лёгка арыентавацца ў мностве прапануемай інфармацыі.

Бібліяграфічны спіс разлічаны на бібліятэчных работнікаў, выкладчыкаў, настаўнікаў, студэнтаў, экскурсаводаў, а таксама будзе карысны ўсім, хто цікавіцца гісторыяй беларускіх гарадоў. У яго ўключаны дакументы, выдадзеныя пераважна за апошнія 10 гадоў.

*Вядучы бібліёграф*
*Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*
***Кацярына Дзмітрыеўна Вараньк***